Нікуліна, М. Яны заваявалі Перамогу: да 45-годдзя адкрыцця Памятнага Знака вызваліцелям / М. Нікуліна // Аршанская газета. – 2023. – 21 кастр. – С. 6.

# ЯНЫ ЗАВАЯВАЛІ ПЕРАМОГУ



**Горад Орша – жывы летапіс гераізму, адданасці і мужнасці яго жыхароў. Ужо прайшло 79 гадоў з Дня Перамогі. Але памяць пра вялікія падзеі не адыходзіць у мінулае, а жыве ў душах тых, хто жыў, змагаўся, ваяваў і перамог у гэтай вайне, а таксама ў памяці ўдзячных нашчадкаў.**

У канцы чэрвеня 1944 года ў час Віцебска-Аршанскай аперацыі войскі левага крыла 3-га Беларускага фронту завязалі бой за авалоданне Оршай. Фашысты ператварылі горад у магутную крэпасць. На подступах да яго і ў горадзе стварылі глыбока эшаланіраваную сістэму абароны са шматлікімі ямамі і дотамі, міннымі палямі і драцянымі агароджамі. Увечары 26 чэрвеня 1944 года часці 11-й гвардзейскай і 31-й армій пры падтрымцы авіяцыі пачалі штурм горада. Ім дапамагалі партызаны. Раніцай 27 чэрвеня Орша была вызвалена ад акупантаў.

Дарагой цаной была здабыта свабода. Жорсткі каланіяльны рэжым беззаконня, гвалту, рабавання і тэрору ў перыяд акупацыі г. Оршы забраў жыцці больш за 30 тысяч чалавек.

Аддаючы належнае ўсім, хто ўнёс уклад у Перамогу, для захавання іх памяці ў Оршы створаны музеі, узведзены помнікі гісторыі. Імёнамі Герояў Савецкага Саюза Юрыя Смірнова, Сямёна Пустэльнікава, Сяргея Грыцаўца, Юрыя Гарохава, Івана Сяржантава названы вуліцы горада.

20 сакавіка 1968 года Аршанскім гарвыканкамам і бюро гаркама КПБ была прынята пастанова аб узвядзенні ў горадзе Оршы па вуліцы Астроўскага Мемарыяльнага Знака, які ўвекавечвае гераічны подзвіг савецкіх воінаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Але тэрмін узвядзення зацягнуўся на доўгія 10 гадоў. У 1978 годзе пачалоея яго будаўніцтва па вул. Міру ў скверы насупраць гасцініцы «Орша».

Манумент быў узведзены аршанцамі: работнікамі будаўнічага трэста № 18, рабочымі льнокамбіната, інструментальнага завода і завода «Чырвоны барацьбіт», а таксама аўтарскім калектывам праекта на чале з начальнікам упраўлення па будаўніцтве і архітэктуры Віцебскага аблвыканкама В. В. Ягадніцкім.

28 кастрычніка 1978 года адбылося ўрачыстае адкрыццё помніка. На цэнтральнай плошчы сабраліся жыхары, госці горада з розных куткоў Савецкага Саюза – удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, былыя воіны і камандзіры воінскіх часцей, якія прымалі ўдзел у вызваленні Оршы, падпольшчыкі і партызаны, ветэраны вайны, піянеры і работнікі прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў.

У 11 гадзін пачаўся мітынг, з рэпрадуктараў даносіўся загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага аб вызваленні горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. З Памятнага Знака было спушчана пакрывала – і перад прысутнымі адкрыўся помнік вызваліцелям Оршы, які быў зроблены з жалезабетону і ўяўляў сабой кампазіцыю з двух маналітных аб'ёмаў. Першы – накіраваная ўверх 15-метровая стэла-абеліск, наверсе якой стылізаваны сцяг з сярпом, молатам, пяцікутнай зоркай, ніжэй надпіс: «Воінам Савецкай Арміі, партызанам і падпольшчыкам – героям бітвы за вызваленне горада Оршы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў». Другі аб'ём – дынамічная стэла-сцяна, на верхняй частцы якой барэльефныя партрэты воіна, падпольшчыцы і партызана, на знешнім баку – назва 41-й воінскай часці і злучэння 3-га Беларускага фронту, якія вызначыліся пры вызваленні Оршы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і атрымалі ганаровыя званні «Аршанскіх». На адваротным баку стэлы-сцяны словы: «Мужнасці, стойкасці, вернасці Маці-Радзіме».

Адкрыццё помніка стала сімвалам вернасці і адданасці подзвігу герояў Вялікай Айчыннай вайны, які жыве і будзе жыць у сэрцах і справах аршанцаў.

**М. НІКУЛІНА,**
**заг. аддзела выкарыстання дакументаў установы «Занальны дзяржаўны архіў г. Оршы».**





Помнік вызваліцелям Оршы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў зараз і раней